**В. Г. Каваленка,** *аспірант*
*кафедры педагогікі сацыякультурнай*
*дзейнасці БДУ культуры і мастацтваў*

# АЎТЭНТЫЧНЫ ПЕСЕННЫ ФАЛЬКЛОР ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ПАЗНАВАЛЬНАГА ІНТАРЭСУ ДЗЯЦЕЙ

На сучасным этапе развіцця грамадства выяўляецца тэндэнцыя да нацыянальна-культурнага адраджэння спадчыны, культурных традыцый беларускага народа. Асэнсоўваючы гістарычны вопыт свайго народа, яго духоўна-маральную аснову, мы разумеем, што, толькі дакрануўшыся да нацыянальнай культурнай спадчыны, можна ацаніць агульначалавечыя каштоўнасці, раскрыць духоўныя сілы і дасягненні народа.

Невычэрпнай крыніцай самабытнасці беларускага народа, яго духоўна-культурных дасягненняў з’яўляецца беларускі песенны фальклор. Гэта важны сродак крышталізацыі духоўнай культуры, выяўлення схільнасці, інтарэсаў народа. Разнастайныя фальклорныя творы раскрываюць жыццё народа, яго светаўспрыманне.

Фальклорная спадчына з’яўляецца важным сродкам фарміравання асобы дзіцяці, бо у фальклоры ўвасаблена шматвекавая мудрасць народа. Значная роля ў гэтым належыць народнай песні.

Раней цікавасць да народнай песні перадавалася праз бацькоў і бабуль. Зараз гэты ланцужок пераймання народных традыцый парушыўся. Дзеці адарваны ад вясковага жыцця, яны актыўна праяўляюць цікавасць да інфармацыйных тэхналогій, кінамастацтва і эстраднай музыкі. Узоры фальклорнай спадчыны разглядаюцца дзецьмі ці ў выглядзе музейных экспанатаў, ці як адна з формаў баўлення вольнага часу. Школьная праграма па музыцы надае вельмі мала часу і ўвагі вывучэнню песеннай фальклорнай спадчыны. Стыхійнасць пераймання песеннага фальклору павінна змяніцца мэтанакіраванай працай па фарміраванні творчай асобы дзіцяці, зацікаўленай народным мастацтвам.

Вырашэнне задачы захавання нацыянальнай спадчыны, выхавання моладзі на традыцыях свайго народа вымушае звярнуцца да разгляду праблемы развіцця пазнавальнага інтарэсу дзяцей сродкамі аўтэнтычнага песеннага фальклору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аўтэнтычны ў перакладзе з грэчаскага азначае *дакладны, сапраўдны* [2]. Аўтэнтычны фальклор мае свой устойлівы жанравы склад, рэпертуар, стыль, выканаўчую манеру, асаблівасці мовы. Ён з'яўляецца часткай духоўнай культуры беларускага народа і існуе ў непарыўнай сувязі з яго працоўным, грамадскім і сямейным побытам.

Аўтэнтычная манера прадугледжвае засваенне адметных асаблівасцей спеваў "з голасу". Кіраўнік дзіцячых калектываў "Верас", "Ветах" і "Гронка" аддзела народных мастацкіх рамёстваў і фальклору Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі лічыць, што "такі спосаб перадачы забяспечвае арганічнасць навучання і трываласць захавання аўтэнтычных стылю і манеры выканання" [4, с. 101]. Па выніках уласных экспедыцый кіраўнік дзіцячых гуртоў і яе выхаванцы ўзнаўляюць этнаграфічныя ўзоры каляндарна-абрадавых свят Полаччыны, Панямоння і Палесся (Купалле, Жаніцьба Цярэшкі, Гуканне вясны, Юр'я, Вялікдзень, Пахаванне стралы, Калядны абход і гульня з казой).

Пераймание аўтэнтычных выканальніцкіх традыцый патрабуе ад удзельнікаў фальклорнага гурту фізічных, псіхалагічных і інтэлектуальных намаганняў. Напрыклад, у купальскіх песнях, у загуканнях вясны эмацыянальнае напружанне для перадачы гучнага выкліку выяўляецца адпаведнымі тэмбрава-дынамічнымі сродкамі. Абрадавыя песні гучаць інакш. Яны патрабуюць менш драматычнай, але больш псіхалагічна збалансаванай экспрэсіі. Абрадавыя песні характарызуюцца прысутнасцю мяккай тэмбральнай афарбоўкі гуку ў прымарных танах (*сі* м.а. – *фа*1), песенна-танцавальным, распеўным тыпам інтанавання [3, с. 39]. Каб ужыцца ў песню, адчуць яе абрадавы кантэкст, неабходна ствараць належныя знакавыя сітуацыі, такім чынам спрабуючы зразумець страчаны сэнс абрадавых дзеянняў. Напрыклад, вясну сустракаюць у лесе, гукаюць "вяснянкі" "з гары на гару", на Вялікдзень і Юр'ю абыходзяць хаты, на Купалле запальваюць вогнішча і водзяць карагоды, завіваюць вянкі, сустракаюць сонейка [4, с. 106]. Такім чынам, сродкамі аўтэнтычнага фальклору (праз абрадавыя цырымоніі, "прапусціўшы праз сябе" народныя звычаі і прыметы) дзеці спазнаюць традыцыі свайго краю, побыт і культуру беларускага народа. Выхоўваючы ў іх зацікаўленасць аўтэнтычным фальклорам, мы развіваем у дзяцей пазнавальны інтарэс не толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да традыцый сваёй мясцовасці, свайго рэгіёна, але і да ўсёй беларускай спадчыны, традыцыйнай культуры.

Пазнавальны інтарэс характарызуецца імкненнем да новых, больш глыбокіх ведаў. Ён з'яўляецца важным фактарам эфектыўнасці працэсу навучання, стымулюе развіццё самастойнасці, пошукава-творчы падыход да авалодання зместам навучання, пабуджае да саманавучання. Без развіцця пазнавальнага інтарэсу актывізацыя дзіцяці да пазнання практычна немагчыма. Таму ў працэсе навучання аўтэнтычнай манеры спеваў неабходна сістэматычна абуджаць і развіваць пазнавальны інтарэс дзяцей і як важны матыў навучання, і як устойлівую рысу асобы, і як моцны сродак выхаваўчага навучання, павышэння яго якасці.

Значны ўклад у распрацоўку праблемы пазнавальнага інтарэсу ў навучанні зроблены Г.І.Шчукінай. Вызначаныя ёю ўзроўні развіцця пазнавальнага інтарэсу ўзяты намі за аснову паспяховага развіцця інтарэсу. Г.І.Шчукіна вызначае наступныя ўзроўні развіцця пазнавальнага інтарэсу: патрэба ва ўражаннях (зацікаўленасць), актыўны пошук прадмета ці з'явы (дапытлівасць), устойлівы інтарэс да пазнання (тэарэтычны інтарэс) [1, с. 176].

Патрэба дзіцяці ва ўражаннях – гэта фундамент развіцця пазнавальнага інтарэсу. На дадзеным этапе патрэбна зацікавіць дзіця адметнымі сродкамі песенных традыцый, імкнуцца выклікаць у яго станоўчыя эмоцыі да аўтэнтычнага фальклору, якія потым стануць падмуркам зацікаўленасці беларускай песеннай культурай ўвогуле. Менавіта зацікаўленасць будзе пераходам да наступнага этапу развіцця інтарэсу – дапытлівасці.

На ўзроўні дапытлівасці вызначаецца інтарэс да аб'екта ў цэлым. Мэта этапу – развіццё інтарэсу да фальклорных заняткаў, выклікаць жаданне пазнаёміцца з адметнымі рысамі аўтэнтычнага песеннага фальклору. Працэс авалодання песеннымі стылямі розных рэгіёнаў Беларусі (Паазер'я, Гомельскага і Брэсцкага Палесся, Цэнтральнага рэгіёна, Панямоння, Падняпроўя) павінен прадугледжваць тэматычную накіраванасць і сістэмны падыход, які носіць ступеньчаты характар.

На першым узроўні замацоўваюцца правільная спеўная пастаноўка і тэхніка дыхання, дзеці авалодваюць спосабам адкрытага народнага гукаўтварэння. Увага накіроўваецца на развіццё навыкаў народных спеваў: плаўнае і роўнае гукавядзенне, грудное рэзаніраванне, чыстае інтанаванне, правільную артыкуляцыю і дакладную дыкцыю. Галоўная задача тут – не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ператвараць рэпетыцыйны працэс у руціну тэхнічнага паўтарэння дробных музычных фраз. Трэба прывабіць увагу дзяцей даступнымі вакальнымі метадамі вывучэння песень з апорай на з'явы асяроддзя і моманты жыцця, уключыць у заняткі гульнявы кампанент.

Наступны ўзровень прадугледжвае мэтанакіраваную пазнавальную дзейнасць. Інтарэс да пазнання на дадзеным этапе вызначаецца ўсвядомленай дзейнасцю, сацыяльна значнымі мэтамі. У аснову навучальнага працэсу пакладзены задавальненне і эмацыянальны пад'ём. Навучанне накіравана на замацаванне навыкаў і ўменняў вакальнай тэхнікі, якія былі атрыманы раней. У рэпертуар уключаюцца песні розных абласцей Беларусі з іх адметнымі асаблівасцямі ў гаворцы і мелодыі.

Узоры рэгіянальнага аўтэнтычнага фальклору – гэта каштоўны матэрыял для выхавання дзіцяці, сродак развіцця ў яго пазнавальнага інтарэсу да спадчыны беларускага народа, яго культуры і традыцый. Як частка музычнай культуры, ён уздзейнічае на эмоцыі, пачуцці, фарміраванне асобы, дапамагае рэалізацыі творчай дзейнасці, бо народнапесенная творчасць – даступная форма развіцця прыродных задаткаў і здольнасцей будучай асобы. З дапамогай аўтэнтычнага фальклору адбываецца далучэнне падрастаючага пакалення да культуры свайго народа, яе старажытных каранёў.

---

1. *Актуальные* вопросы формирования интереса в обучении / под ред. Г.И.Щукиной. – М.: Просвещение, 1984. – 176с.

2. *Беларускі* фальклор: энцыклапедыя. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2005. – Т. 1.

3. *Мухаринская, Л.С.* Белорусская народная песня. Историческое развитие: очерки / Л.С.Мухаринская; ред. З.Я.Можейко. – Мн.: Наука и техника. 1977. – 39 с.

4. *Традыцыйная* культура і дзеці: праблемы этнавыхавання: матэрыялы III Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (19–20 красавіка 2006г., г.п. Акцябрскі). – Мн., 2006. – 106 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ